# ВЭБ-САЛІДАРНАСЦЬ-2010: ДАБРАЧЫННАСЦЬ У РЭАЛЬНЫМ РЭЖЫМЕ

**Міхаіл Нядзвецкі**[1]

## Abstract

The article reviews the phenomenon of people's solidarity in the Belarusian segment of the Internet which could be observed during and after the presidential elections on December 19, 2010. The author sees the basic functions of the Internet in spreading of solidarity ideas. He examines the most significant and well-known aid initiatives for victims. The author attempts to forward the description of the traditional practice of Internet usage in social activities into another dimension: from its mythical ideologizing into the applied mechanism to organize work in reality.

Keywords: Solidarity, December 19, presidential election, Belarus, Internet, «Square».

## Уступ і апісанне сітуацыі напярэдадні выбараў

Лічыцца, што да ўзнікнення народнай салідарнасці ў інтэрнэце прывёў хуткі і жорсткі разгон Плошчы 19 снежня. Але аўтар лічыць, што зыходным пунктам з'яўляюцца не сумныя падзеі вечара асноўнага дня галасавання, а ранейшая дата. Такое меркаванне ўзнікла таму, што салідарныя дзеянні распачаліся ўжо ад старту актыўнага перыяду прэзідэнцкай кампаніі – збору подпісаў. Тады яны праяўляліся ў распаўсюдзе агульнай інфармацыі пра ход кампаніі: у асноўным асвятляліся прэцэдэнты з парушэннямі[2] ды іншыя актуальныя навіны.

У інтэрнэт-прасторы з'явіліся сайты *election.in-by.net*, *vybory2010.by*, *belpolitics.org*[3], *dec19.org*[4], якія падавалі інфармацыю з пералікам звестак па кожным з кандыдатаў (біяграфія, праграма, навіны і інш.) і па кампаніі ў цэлым. Агульную інфармацыйную скіраванасць меў таксама і сайт *ploshcha.com*, але ён выконваў таксама ролю мабілізацыйнага рэсурсу, што пацвярджае ўскосна яго назва. У якасці прыкладаў негатыўнай кампаніі (меліся толькі ў адрас дзеючага прэзідэнта) можна назваць сайт кампаніі *«Сыходзь!»*[5]. Вялікі рэзананс выклікаў

[1] Міхаіл Нядзвецкі – палітолаг, навуковы супрацоўнік Інстытута палітычных даследаванняў «Палітычная сфера» (Вільня – Мінск; Літва – Беларусь).

[2] Гл.: http://belhelcom.org/node/8945; http://twitter.com/vybary2010.

[3] Рэсурс пазіцыянаваўся як «Першая палітычная сацыяльная сетка».

[4] Сайт грамадзянскай ініцыятывы «19 снежня».

[5] Перадвыбарчая кампанія «Маладога фронту». Сайт размяшчаецца па адрасе: http://www.syhodz.info/

відэаролік «*Бабуля-2010*», які быў выкладзены на партале *youtube.com* 28 лістапада і за першы дзень прагледжаны 23 тысячы разоў.[6] На рэсурсе *livejournal.com* інфармацыя, звязаная з выбарамі, акумулявалася ў суполцы «*Беларуская палітыка*».[7]

Не засталася па-за ўвагай прэзідэнцкая кампанія і ў сацыяльных сетках. Так, на рэсурсе *vkontakte.ru* можна вылучыць тры асноўныя інфармацыйныя суполкі выбарчай тэматыкі: «Выбары 2010. Беларусь»[8]; «Выборы 2010: *in-by.net* (приложение, биографии, программы и пр.)»[9] і «Президентские выборы 2010 (Беларусь). Экзит-пул. *ЗА КОГО ГОЛОСОВАЛИ ВЫ?*»[10]. Акрамя таго, на гэтым жа рэсурсе была створана суполка[11] з заклікам сабрацца на Кастрычніцкай плошчы ўвечары 19 снежня (мал. 1).




Мал. 1. Аватар з заклікам выйсці на Плошчу 19 снежня. Актыўна распаўсюджваўся ў сацыяльнай сетцы vkontakte.ru

6 http://www.svaboda.org/content/transcript/2230880.html.
7 http://by-politics.livejournal.com.
8 http://vkontakte.ru/club15428665. Па стане на 23:59 18.12.2010 г. сябрамі суполкі з'яўляліся 4 598 удзельнікаў.
9 http://vkontakte.ru/club20809720. Па стане на 23:59 18.12.2010 г. сябрамі суполкі з'яўляліся 133 удзельнікі.
10 http://vkontakte.ru/club4618077. Па стане на 23:59 18.12.2010 г. сябрамі суполкі з'яўляліся 179 удзельнікаў.
11 http://vkontakte.ru/event16839117. Па стане на 23:59 18.12.2010 г. сябрамі суполкі з'яўляліся 7 651 удзельнік.

Па меры набліжэння асноўнай даты галасавання была створана суполка *«Ночлег 19 декабря в Минске. Заселим людей с других городов во время президентских выборов!»*[12], удзельнікі якой прапаноўвалі іншагароднім грамадзянам начлег перад і, як меркавалася, у дні падчас пратэстнай акцыі. Тэма з аналагічнай прапановай была адкрыта і ў адной з суполак блога *livejournal*[13].

Праз сацыяльныя сеткі і блогі распаўсюджвалася карысная інфармацыя для тых, хто намагаўся прыняць актыўны ўдзел у акцыі 19 снежня: як перанесці холад[14]; як паводзіць сябе падчас руху маніфестантаў[15]; інфармацыя пра меры бяспекі[16] і г. д. Для менш актыўных (ці на слэнгу – «тых, хто спачувае ў інтэрнэце») прапаноўвалася інфармацыя пра меры абыходу блакіроўкі сайтаў у выніку яе ўвядзення.[17]

Характарызуючы распаўсюджванне інфармацыі праз сацыяльныя сеткі і блогавыя сістэмы, можна выдзеліць два асноўныя метады.

Першы – «метад звяна» – праяўляецца ў тым, што інфармацыя распаўсюджваецца ад аднаго чалавека да другога і гэтак далей у *n*-ай колькасці. Пры гэтым зусім не абавязкова, каб усе людзі са звяна былі знаёмыя паміж сабой у рэальным жыцці. Тэхнічнае вырашэнне сацыяльных сетак і блогаў дазваляе выкарыстоўваць такі метад праз адмысловыя опцыі: *«падзяліцца»* (як на рэсурсах *vkontakte* і *facebook*); *repost* (*livejournal*) і *retweet* (для мікраблога *tweeter*).

Другі метад – «метад слупа» – праяўляецца хутчэй не ў распаўсюдзе інфармацыі, а ва ўзроўні рэзанансу, які яна можа набыць. Гэты метад праяўляецца ў колькасных і якасных паказчыках каментавання тэкставай і/ці мультымедыйнай інфармацыі. У сацыяльных сетках выкарыстанне «метаду слупа» зводзілася да таго, што карыстальнікі пакідалі каментары або адзначалі той ці іншы допіс значкам «упадабаць» («like»). Дадзены метад нельга назваць занадта эфектыўным, бо распаўсюду інфармацыі пры яго выкарыстанні магло ўвогуле не быць, альбо ён адбываўся ў вузкім коле. Падчас выбарчай кампаніі інфармацыя ў вэб-прасторы распаўсюджвалася пры дапамозе як першага, так і другога метадаў. Часам абодва метады выкарыстоўваліся адначасова, утвараючы змяшаную сістэму.

Некаторыя рэсурсы былі скіраваны на павелічэнне ўзроўню зацікаўленасці выбарчай кампаніяй: гэта дазваляла назіраць за ўсім працэсам «тут і цяпер». У якасці аднаго з метадаў для дасягнення гэтай мэты была выкарыстана інтэрактыўнасць. Інтэрактыўныя рэсурсы даюць магчымасць кожнаму карыстальніку незалежна ад

12 http://vkontakte.ru/club22266299. Правапіс назвы суполкі захаваны ў арыгінале – М. Н. Па стане на 23:59 18.12.2010 г. налічвала 118 удзельнікаў.

13 http://minsk-by.livejournal.com/6982259.html

14 http://kilgor-trautt.livejournal.com/612496.html

15 http://by-politics.livejournal.com/2616506.html

16 http://petra-leleka.livejournal.com/305618.html?nc=33

17 https://docs.google.com/document/d/1Vf7BuI80KQmVXOLSUHnPbkk6TjDP_LdJkzzpkKRTHA/edit?pli=1#

яго ўзросту, прафесіі і іншых паказчыкаў быць «у адной камандзе з усімі». Гэты фактар вельмі важны з пункту гледжання сацыяльнай псіхалогіі, бо такім чынам магчыма арганізаваць эфектыўную каманду з неабыякавых удзельнікаў. У якасці прыклада арганізацыі такой каманды можна назваць практыку стварэння і выкарыстання хэш-тэга *#electby* у мікраблогавай сістэме *twitter*. Кожны з карыстальнікаў гэтага рэсурсу цяпер мог сам стаць «ньюсмэйкерам», дадаўшы ва ўласны запіс гэты тэг. Калі інфармацыя прадстаўляла цікавасць для большасці, то запіс трапляў у твітэр-акаўнт *by_elect*[18], у якім збіраліся навіны па выбарчай кампаніі.

У якасці інтэрактыўных рэсурсаў таксама выкарыстоўваліся формы інтэрнэт-галасавання: на сайце *election.in-by.net*, у аднайменных суполках сацыяльнай сеткі *vkontakte* і мікраблога *twitter*[19]; таксама ў якасці самастойнай праграмнай прылады для рэсурсу *vkontakte.ru*[20]. Яшчэ адным прыкладам дзейнасці сістэматызаванага анлайн-галасавання з'яўляецца сайт *belarusvotes.com*.

Пачатак датэрміновага галасавання прынёс павелічэнне звязанай з выбарамі інфармацыі, якая збольшага тычылася розных відаў парушэння заканадаўства. Акумуляцыя такой інфармацыі праходзіла на рэсурсах, створаных на вэб-платформе *ushahidi*[21] (з мовы суахілі – «сведка», «сведчыць»). Платформа канцэнтруе сацыяльную актыўнасць, грамадзянскую журналістыку і геапрасторавую інфармацыю і дае назіральніку магчымасць выкладваць інфармацыю, скарыстаўшыся адпраўкай *SMS* ці электроннага ліста, а таксама выкарыстоўваючы ўласныя акаўнты сацыяльных сетак. Усе атрыманыя дадзеныя збіраюцца, сістэматызуюцца і аўтаматычна накладваюцца на мапы. У Беларусі самым вядомым праектам выкарыстання такой тэхналогіі з'яўляўся сайт *electby.org*. Але акрамя яго існаваў спецыяльны праект рускай службы радыёстанцыі *Голас Амерыкі* «Выбары ў Беларусі. Грамадзянскі кантроль»[22].

## Інтэрнэт як рухавік народнай салідарнасці

Імгненны і малавыдаткавы распаўсюд інфармацыі ёсць галоўным плюсам інтэрнэту, які зрабіў вялікі ўнёсак ў папулярызацыю ідэі салідарнасці. Але распаўсюд інфармацыі не з'яўляецца аднароднай з'явай, бо па розных прычынах мае сваю спецыфіку, мэты і вынікі. Разам з падзеямі, якія адбыліся 19 снежня і пасля гэтай даты, важна вылучыць розныя віды распаўсюду інфармацыі, улічваючы вышэйзгаданыя фактары.

На думку аўтара, у распаўсюдзе інфармацыі пра салідарнасць і яе папулярызацыі інтэрнэт выконваў наступныя функцыі:

---

[18] http://twitter.com/by_elect
[19] http://twitter.com/election_in_by
[20] http://vkontakte.ru/app1983814
[21] Галоўны сайт: http://ushahidi.com/
[22] http://golosameriki.crowdmap.com/

• агульнае інфармаванне пра тое, што здарылася 19 снежня ў Мінску;

• рэкрутаванне валанцёраў для дабрачынных праектаў і інфармаванне гэтай катэгорыі;

• пляцоўка для пошуку людзей, якія трапілі ў медыцынскія і пенітэнцыярныя ўстановы; стварэнне «чорнага спісу» правакатараў, супрацоўнікаў міліцыі і некаторых іншых устаноў;

• канал для распаўсюду самвыдавецкай прадукцыі;

• збор грашовых сродкаў праз віртуальныя плацежныя сістэмы і інфармаванне пра збор грошаў наяўнымі;

• салідарныя дзеянні з канкрэтнымі асобамі;

• правядзенне флэш-мобаў у вэб-прасторы.

У асноўны дзень галасавання ўлады пачалі блакаваць вэб-рэсурсы. У прыватнасці, былі створаны фальшывыя люстэркавыя сайты некаторых кандыдатаў у прэзідэнты з даменам *.in*; адбылося адключэнне зашыфраванага злучэння (https); некаторыя інфармацыйныя рэсурсы падвергліся масіраванаму DDoS-нападу (больш-менш стабільна працаваў толькі рэсурс *vkontakte*, таму ён і стаў асноўным інфармацыйным цэнтрам). Адразу ж салідарныя дзеянні былі накіраваны на распаўсюд інфармацыі пра меры абыходу блакіроўкі (хаця гэта інфармацыя распаўсюджвалася яшчэ напярэдадні). Працягвалі дапаўняць карціну выбараў і інтэрактыўныя рэсурсы: на сайце *electby.org* мапа з маркёрамі парушэнняў стала значна больш інфарматыўнай.

Дата 19 снежня была яшчэ адзначана ініцыятывай, ідэя якой была агучана загадзя – т. зв. акцыя *Дзень без фэйса*. Карыстальнікам сацыяльнай сеткі *facebook* прапаноўвалася замяніць свае профільныя выявы («аватары», «юзэрпікі») на малюнак (мал. 2).




Мал. 2. Аватар ініцыятывы *Дзень без фэйса*

Ініцыятыва па змяненні профільных выяваў станецца далёка не апошняй і ўвойдзе пасля ў звычайную практыку. Ужо пасля разгону акцыі пратэсту карыстальнікі сацыяльных сетак і блогаў у знак салідарнасці сталі масава мяняць свае профільныя выявы. Самыя папулярныя выявы прыведзены ніжэй (мал. 3–6).

Пасля 19 снежня да ініцыятывы змены профільных выяваў далучылася Беларуская асацыяцыя журналістаў, якая прапанавала свае варыянты.[23]

---

[23] http://baj.by/m-p-viewpub-tid-1-pid-9730.html




Мал. 3. Аватар ініцыятывы змены профільнай выявы ў блогавай сістэме *livejournal.com*



Мал. 4. Чорны квадрат – адно з самых простых графічных выкананняў знаку салідарнасці




Мал. 5. «Патрабуем вызваліць нашых таварышаў»



Мал. 6. Свечкі як сімвал салідарнасці з пацярпелымі

З пачаткам акцыі пратэсту – *Плошча-2010* – у сацыяльных сетках і блогу *livejournal*[24] пачалася анлайнавая трансляцыя з месца асноўных падзей. Акрамя тэкставай быў вялікі аб'ём і мультымедыйнай інфармацыі: фотаздымкі і відэазапісы (журналісцкія і аматарскія).[25] Прамую трансляцыю з акцыі вёў інфармацыйны партал *tut.by*.

Пасля разгону *Плошчы* і пачаткуператрусаў на офісах недзяржаўных арганізацый і прыватных кватэрах актывістаў вельмі бракавала інфармацыі пра дакладную колькасць затрыманых і месца іх знаходжання. На працягу некалькіх дзён абсалютна няяснай была сітуацыя з Уладзімірам Някляевым. У Сеціве нават хадзілі чуткі, што былы кандыдат быў забіты. Дарэчы, што тычыцца чутак, то цалкам можна зразумець прыроду іх паходжання, асабліва ў экстрэмальных сітуацыях: большасць людзей не чакала развіцця падзеяў па найгоршым са сцэнараў і ўспрымала любую інфармацыю эмацыйна і нават наіўна. Калі разгон *Плошчы* яшчэ не завяршыўся, у інтэрнэце ўжо распаўсюджваліся паведамленні пра чалавечыя ахвяры: падчас самога разгону і на станцыі метро «Плошча Леніна». Аўтар не адмаўляе, што дэзінфармацыя была спецыяльна ўкінута нядобразычліўцамі для захавання панічных настрояў і пачуцця страху ў грамадстве. Падобную сітуацыю мы маглі назіраць пасля тэракту ў мінскім метро 11 красавіка, калі на форумах і ў сацыяльных сетках распаўсюджвалася несапраўдная інфармацыя пра выбухі ў аўтобусе № 100, на аўта- і чыгуначным вакзалах.

---

24 http://minsk-by.livejournal.com/7008041.html?nc=119

25 http://karpenkod.blogspot.com/2010/12/blog-post_20.html; http://invizio.livejournal.com/669.html; http://invizio.livejournal.com/787.html; http://invizio.livejournal.com/1164.html

Першыя дакладныя спісы затрыманых і тых, хто трапіў у шпіталі, з'явіліся 23 снежня. Некаторыя з іх складаліся на базе *googledocs*[26] і выкладваліся ў інтэрнэт у свабодным доступе (г. зн. маглі быць прачытаныя тымі, хто не мае паштовай скрыні ў сістэме *gmail.com*).

Сістэматызацыяй дадзеных па затрыманых і асуджаных займалася таксама грамадзянская ініцыятыва *Анёл-ахоўнік*[27], якая паўстала на наступны дзень пасля разгону дэманстрацыі. Улічваючы, што такая ініцыятыва ўяўляе класічную мадэль *grassroots* і мае патрэбу ў валантарыяце, то разам са спісамі распаўсюджвалася інфармацыя пра рэкрутаванне дапамагатых з апісаннем канкрэтнай працы[28]. Акрамя гэтага, падаваўся спіс рэчаў, прадуктаў харчавання, якія можна было перадаваць асуджаным.[29]

Апрача рэчаў і прадуктаў можна было рабіць і грашовыя ахвяраванні. Для гэтага былі адкрыты банкаўскія рахункі і рахункі ў сістэмах электронных плацяжоў *easypay* і *webmoney*. Сабраныя фінансы скіроўваліся, напрыклад, на аказанне медыцынскай дапамогі збітай падчас разгону *Плошчы* Маі Абромчык[30]; Таццяне Грачаннікавай[31], у якой падчас адседкі ў СІЗА абвастрылася цяжкая хвароба. Сродкі дапамаглі ў поўным аб'ёме кампенсаваць страты ў памеры Br 14 млн падчас «штурму» Дома Урада[32]. Інфармацыя пра дапамогу распаўсюджвалася таксама ў адным з акаўнтаў у мікраблогавай сістэме *twitter*[33].

### Сацыяльныя сеткі як «дошка ганьбы»

Выкарыстанне ў паўсядзённым жыцці сацыяльных сетак мае і свае пагрозы: часам, карыстальнікі выкладваюць у вэб-прастору асабістыя дадзеныя (нумары тэлефонаў, хатнія адрасы, імёны і прозвішчы сваякоў і інш.), якія потым могуць быць лёгка выкарыстаны супраць іх. Як спрацаваў гэты механізм, упэўніліся, калі ў Сеціве пачалі распаўсюджвацца спасылкі на акаўнты[34] у сацыяльнай сетцы *vkontakte* спецназаўцаў. Пры гэтым, дзівіла наяўнасць жорсткіх выказванняў у бок апазіцыі ад тых, хто ўдзельнічаў у зачыстцы плошчы Незалежнасці.[35] Самымі папулярнымі «героямі»

---

26 https://spreadsheets.google.com/ccc?authkey=CNGrwbME&key=tUS5ZeMhP6AG2ZQmrh9gt5A&authkey=CNGrwbME#gid=5
27 http://www.help.roh-roh.net/
28 http://adelka.livejournal.com/262866.html
29 http://adelka.livejournal.com/263425.html; http://adelka.livejournal.com/266659.html
30 http://nn.by/?c=ar&i=50412
31 http://nn.by/?c=ar&i=52741; http://imbierac.livejournal.com/23098.html
32 http://nn.by/?c=ar&i=50722; http://adelka.livejournal.com/280868.html
33 http://twitter.com/samadapamoga
34 http://ezhimo.livejournal.com/109187.html?page=2&cut_expand=1
35 Гл. фотальбом: http://vkontakte.ru/album-18923125_123942335. Спецназаўцы самі адзначалі сябе на фотаздымках, якія былі зроблены падчас разгону дэманстрацыі ўвечары 19 снежня, што паскорыла працэс іх пошуку і ідэнтыфікацыі.

аказаліся нехта Ігар Савіцкі[36] і Саня Воцінаў[37] (арыгінал напісання імя захаваны. – *М. Н.*): іх старонкі падвергліся найбольш актыўнаму ганьбаванню, у выніку якога гэтыя людзі паспешліва пачалі выдаляць ўсю інфармацыю і рэгістраваць новыя акаўнты.

Асобная частка інфармацыі і складання чорных спісаў была прысвечана правакатарам, якія разбівалі вокны і дзверы Дома Урада ў момант, калі побач праходзіла акцыя пратэсту. Самая цікавая інфармацыя па правакатарах акумулявалася ў блогу *zmagarka.livejournal.com*, дзе акрамя тэкставых запісаў уладальнік выкладваў мультымедыйную інфармацыю[38] (нават з атрыманымі расшыфроўкамі радыёперамоваў паміж сілавікамі і правакатарамі[39]). Сабраная інфармацыя давала магчымасць даказаць, што акцыя штурму была спланаваная спецслужбамі, і што ў планы апазіцыйных кандыдатаў яна не ўваходзіла.

Акрамя інфармацыі пра спецназаўцаў і правакатараў у інтэрнэце распаўсюджваліся персанальныя дадзеныя, напрыклад, старшыні адной з выбарчых камісіяў Рамана Хмеля. У спісе з'явіўся і галоўны ўрач бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі Віктар Сірэнка, якога праваабаронцы абвінавацілі ў парушэнні прафесійнай этыкі.[40] З пачаткам першых судовых працэсаў над удзельнікамі маніфестацыі ў інтэрнэце пачала распаўсюджвацца інфармацыя пра суддзяў. У акаўнце суддзі Вольгі Комар у *фэйсбуку* разгарэлася дыскусія[41], у якой прыняла ўдзел і сама Комар[42].

Збор дадзеных па асобах, якія скампраметавалі сябе ў падзеях 19 снежня (і пасля іх) адбываўся праз электронны адрас *chornyspis2010@gmail.com*. Акрамя гэтага, быў створаны спецыяльны сайт *posobniki.com*.

У гэту сумную кампанію ўмоўна аднесены і экс-кандыдат у прэзідэнты Яраслаў Раманчук, які «праславіўся» сваёй заявай ад 20 снежня[43], дзе асудзіў правакацыю са штурмам, абвінаваціўшы ва ўзнікненні яе некаторых апазіцыйных кандыдатаў. Рэакцыі доўга чакаць не прыйшлося: на сцяну старонкі[44] былога кандыдата абрынулася лавіна незадаволеных запісаў, нават з боку тых, хто яшчэ ўчора галасаваў за Раманчука. Запісы з абурэннямі межавалі з запісамі,

---

36 http://vkontakte.ru/id95489720
37 http://vkontakte.ru/id20431196
38 http://zmagarka.livejournal.com/1120792.html#cutid1; http://zmagarka.livejournal.com/1129362.html; http://zmagarka.livejournal.com/1168801.html#cutid1
39 http://zmagarka.livejournal.com/1144463.html
40 Маецца на ўвазе эпізод вечара 19 снежня, калі Сірэнка дазволіў прадстаўнікам спецслужбаў вывезці цяжка параненага Уладзіміра Някляева са шпіталю.
41 http://nn.by/index.php?c=ar&i=50689
42 Праўда «плюралізм меркаванняў» цягнуўся нядоўга, бо ўладальнік профіля хутка вырашыла зрабіць яго закрытым.
43 http://www.youtube.com/watch?v=tX2-oNI_Rrc
44 http://www.facebook.com/pages/%D0%AF%D1%80%D0%BE%D1%81%D0%BB%D0%B0%D0%B2-%D0%A0%D0%BE%D0%BC%D0%B0%D0%BD%D1%87%D1%83%D0%BA/157502274264924

якія ўтрымлівалі абразы і кпіны ў бок кандыдата, бо многія палічылі Раманчука здраднікам. Толькі за 20 снежня каля 700 карыстальнікаў выдалілі акаўнт кандыдата з ліку сваіх сяброў.

### Інтэрнэт як канал распаўсюду «самвыдату»

Распаўсюд інфармацыі праз інтэрнэт можа зусім не закранаць тую катэгорыю грамадства, якая мала карыстаецца ці не карыстаецца ўвогуле гэтым сродкам, што ўсё яшчэ актуальна для Беларусі. Таму ў сувязі з гэтым было прапанавана правесці ў Сеціве кампанію па распаўсюду самвыдавецкай прадукцыі, пасля чаго раздрукоўваць яе ў хатніх умовах і распаўсюджваць па паштовых скрынях. Заклікі далучыцца да гэтай кампаніі прагучалі сярод некаторых блогераў[45], пасля чаго абвесткі перасунуліся і ў сацыяльныя сеткі. Таксама распаўсюджваліся спасылкі на ўзоры самвыдату, якія былі выкананы на платформе *googledocs* і выстаўляліся ў адкрытым доступе.[46] У 2011 г. быў створаны цэлы партал нагляднай агітацыі *antibrainwash.net* з пералікам улётак і плакатаў і магчымасцю іх спампаваць.

### *Адрасныя кампаніі падтрымкі*

Апроч салідарных дзеянняў, якія разлічваліся на агульную катэгорыю (пад зборным паняткам «пацярпелыя»), мелі месца ініцыятывы адраснага характару. У якасці такіх прыкладаў можна прывесці распаўсюд інфармацыі пра акцыю салідарнасці ля Акрэсціна[47] 21 снежня[48]; кампанію ў падтрымку «Аўтарадыё»[49]; правядзенне *Выставы Салідарнасці*[50]; кампанію салідарнасці блогераў з журналістам Андрэем Пачобутам[51]. Пры гэтым, адбыўся выпадак, калі адзін з блогераў па ўласнай ініцыятыве праводзіў кампанію салідарнасці[52].

---

45 http://abc-in-lj.livejournal.com/21181.html з двума прыкладамі ўлётак

46 http://zmagarka.livejournal.com/1086268.html; https://docs.google.com/viewer?a=v&pid=explorer&chrome=true&srcid=0B30qgqUsynSdODI0M2M0ZTctYTAwNi00ODc4LWFiMWItODBjNDcyYzVmN2I2&hl=en; https://docs.google.com/viewer?a=v&pid=explorer&chrome=true&srcid=1ECFMoIgWl8Dvrjsmdxzo1fAxUV6wVLvMbCzREtitR66RXi4gSVbUy4-RhDB1&hl=en&authkey=CICZnoUI; http://narod.ru/disk/1913778001/Rezanans2.pdf.html

47 Ізалятар часовага ўтрымання ў Мінску: першы завулак Акрэсціна, 36А. «Праславіўся» як месца масавай адседкі людзей пасля разгону намётавага гарадка ў сакавіку 2006 г.

48 http://nn.by/?c=ar&i=47862

49 http://mfront.net/content.php?content.3550

50 http://generation.by/doc14-472.html

51 http://fotaczka.livejournal.com/201002.html

52 Як, напрыклад, блогер *budimir*, які аб'явіў бестэрміновую галадоўку да таго моманту, пакуль не будуць вызвалены ўсе палітвязні (гл. тут: http://budimir.livejournal.com/103720.html). Скончыў галадоўку на дваццаты дзень.

Незалежна ўтварылася ініцыятыва з падпісаннем паштовак палітвязням, якая базуецца на сайце *pashtouka.org.* Ідэя ініцыятывы палягае ў тым, што на самім сайце можна абраць паштоўку з некалькіх варыянтаў, абраць адрасата і, запоўніўшы спецыяльную форму, адправіць яе. Па словах ініцыятараў, у першыя дні паслугай скарысталіся больш за тысячу чалавек.[53] Такі поспех ідэі палягае, хутчэй за ўсё, у эканоміі часу, хаця падобныя акцыі ўжо мелі месца, калі ў турмы адпраўляліся паштоўкі запоўненыя ад рукі.[54]

*Флэш-мобы як традыцыйны элемент салідарнасці*

Нягледзячы на трагічнасць падзей, некаторыя карыстальнікі ўсё ж не гублялі пачуцця гумару і прыдумвалі забаўляльныя акцыі, такія як кампанія *ШОС*[55] ці флэш-моб з рондалямі[56]. Фантазія народных гумарыстаў наконт ідэі *ШОС* была развіта далей, пра што сведчыць альбом калажаў у суполцы на рэсурсе *vkontakte.ru*[57].




Мал. 7. Рэстайлінг лагатыпу адной з грамадскіх кампаніяў пад *ШОС*

Што тычыцца флэш-моба з рондалямі, то падставай да яго правядзення стала выказванне старшыні Цэнтральнай выбарчай камісіі Лідзіі Ярмошынай раніцай 20 снежня, калі яна выказалася пра жанчын, якія прынялі ўдзел у акцыі напярэдадні: *«Сидели бы дома, борщ варили, а не по площадям шастали. Это позор для женщины – участвовать в подобных мероприятиях»*[58]. Цытата стала крылатай, а сама Ярмошына была нават намінавана ў прэміі «Сексіст года 2010»[59] расійскай інтэрнэт-ініцыятывы.

Гэтыя два моманты з'яўляюцца, бадай, адзіным пазітывам ва ўсіх сумных падзеях, звязаных з 19 снежня.

[53] http://anei-aka-kirian.livejournal.com/284312.html

[54] У асноўным гэта былі паштоўкі з віншаваннямі з Калядамі і Новым годам, бо тэрмін знаходжання за кратамі для большасці арыштаваных якраз прыпаў на гэтыя святы

[55] Абрэвіятура склалася з пачатковых літар фразы на трасянцы "Шоб Он Сел"; таксама ходзіць і больш жортскае тлумачэнне: "Шоб Он Сдох".

[56] http://petra-leleka.livejournal.com/325483.html#cutid1

[57] http://vkontakte.ru/album-23966472_127554172

[58] Аўдыёзапіс таго выказвання можна паслухаць тут: http://euroradio.fm/ru/node/3930.

[59] http://www.zafeminizm.ucoz.ru/news/premija_seksist_goda_2010_itogi/2011-01-13-28